# У МІНСКУ ГАВОРАЦЬ ПРА МІР

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Паміж Захадам і Расіяй набіраюць абароты санкцыйнае і інфармацыйнае супрацьстаянне, гандлёвыя войны. Яны сталі штодзённасцю, штодзённай справай. Не відаць канца нагнятанню сітуацыі паміж ЗША, ЕС і Расіяй, а цяпер уцягваюць і Кітай, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Актыўна раскручваецца махавік гонкі ўзбраенняў. І многія усведамляюць высокі ўзровень супрацьстаяння — пакуль, праўда, без маштабнага «гарачага» канфлікту. На думку спецыялістаў, сёння сітуацыя горшая, чым у часы халоднай вайны».



Фота БелТА.

## ПАГРОЗЫ НОВЫЯ, РАШЭННЯЎ НЯМА

Прэзідэнт дадаў, што ў адрозненне ад даволі прадказальнага саперніцтва Савецкага Саюза і ЗША, найважнейшай адзнакай сённяшняй сітуацыі, наадварот, з'яўляецца непрадказальнасць.

Таксама беларускі лідар звярнуў увагу, што разам з беспрэцэдэнтным ростам тэрарызму, колькасці рэгіянальных канфліктаў, магутнымі сацыяльна-эканамічнымі дысбалансамі, фундаментальнымі пагрозамі дэмаграфічнага і экалагічнага характару мы сутыкаемся з новымі выклікамі, якія трансфармаваліся.

Паводле яго слоў, сваю ролю выконваюць электронныя і лічбавыя метады, якія выкарыстоўваюцца ў палітычнай барацьбе і медыяпрасторы, бо, па сутнасці, інфармацыя — гэта новая зброя.

«Кіберуздзеянне стала фактарам усеагульнай уразлівасці, тым больш пры адсутнасці якіх-небудзь правілаў у гэтай сферы. І часцяком адразу не зразумееш, хто за ўсім гэтым стаіць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Стала відавочна, што многія ранейшыя рэцэпты глабальнага і рэгіянальнага кіравання, пераадолення канфліктаў і натуральных супярэчнасцяў ужо не падыходзяць. Яны часта не спрацоўваюць, а новыя яшчэ не выпрацаваны.

Кіраўнік дзяржавы са шкадаваннем адзначыў, што ў гэтых умовах сусветныя гульцы не гатовыя да спынення канфрантацыі і нават да кампрамісаў. «Мы бачым, што ніводная міжнародная праблема рэальна не вырашаецца», — дадаў ён.

У якасці прыкладаў беларускі лідар прывёў Блізкі Усход, Сірыю, Украіну, абстаноўку вакол Паўночнай Карэі, «вузел» вакол пагаднення па іранскай ядзернай праграме. Неабходны глыбокі аналіз.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што і Беларусі, і шматлікім краінам Цэнтральнай і Усходняй Еўропы пагражае апынуцца на лініі цывілізацыйнага разлому, бо бяспека з абстрактнага паняцця стала канкрэтнай з'явай, а яе адсутнасць у любы момант можа закрануць кожнага.

«Таму калі сёння вялікія дзяржавы не могуць дамовіцца паміж сабой, то гэта не азначае, што ўсе астатнія краіны павінны сядзець моўчкі і чакаць іх указанняў, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Перакананы, што Еўропа можа і павінна паказаць прыклад у вырашэнні пытанняў, якія існуюць паміж Усходам і Захадам. Стаць месцам урэгулявання надзённых праблем. Перш за ўсё такіх, як украінскі крызіс».

## ДАПАМОГА БЛІЖНЯМУ

«Найбліжэйшая да Беларусі і геаграфічна, і ў чалавечым дачыненні гарачая кропка — Данбас, дзе працягваюць гінуць ні ў чым не вінаватыя мірныя жыхары, перш за ўсё — старыя і дзеці, якія там засталіся. Да гэтага часу цалкам не выкананы ніводны пункт мінскіх пагадненняў», — канстатаваў беларускі лідар.

Ён таксама дадаў, што Украіна — не проста сусед, а, як і расіяне, гэта братэрскі народ. «Мы прынялі ў сябе — удумайцеся толькі — за кароткі прамежак часу больш за 150 тысяч бежанцаў, украінскіх перасяленцаў і іх сем'яў. Дапамагаем ім у працаўладкаванні, медабслугоўванні, сацыяльнай і псіхалагічнай адаптацыі. Аказваем гуманітарную дапамогу людзям па абодва бакі «лініі размежавання» на Данбасе», — распавёў Аляксандр Лукашэнка.

Ён таксама адзначыў, што апошнім часам некаторыя СМІ пачынаюць папракаць Беларусь, што наша краіна нібыта рвецца ў міратворцы. «Паважаныя спадары, мы нікуды не рвёмся. У нас сваіх праблем больш, чым дастаткова. Але я ўжо сказаў пра нашу зацікаўленасць у спакоі ва Украіне. Калі там не будзе міру, то будзе горача не толькі нам, але і ўсім вам. Гэта канфлікт трэба як мага раней не проста пагасіць — ліквідаваць. І ў гэтым вы можаце на нас разлічваць. Мы зробім усё, пра што дамовіцца канфліктуючыя бакі», — сказаў Прэзідэнт.

Па словах кіраўніка дзяржавы, адзіны шлях урэгулявання любых міжнародных спрэчак — адмовіцца ад эмоцый, назапашаных крыўд, прадузятасцяў, узаемных абвінавачванняў і вярнуцца да дыялогу.

## ЗБЛІЖАЕМ ПОЛЮСЫ

Далей Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь — гэта суверэнная дзяржава, якая выразна ўсведамляе сваё становішча на міжнароднай восі каардынат. Наша краіна не з Расіяй супраць Еўропы і не з Еўропай супраць Расіі, для нас у прынцыпе непрымальнае пытанне, з кім мы, дадаў беларускі лідар.

Саюзніцкія адносіны з Расіяй, арыентацыя на інтэграцыю ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза ні ў якай меры не ўшчамляе інтарэсаў краін Еўропы. І наадварот: развіццё адносін з ЕС, ЗША, Захадам не супярэчыць дынаміцы цеснага ўзаемадзеяння на Усходзе, а служыць стварэнню зоны даверу.

Для Беларусі адным з ключавых кампанентаў бяспекі быў і застаецца эканамічны. На думку кіраўніка дзяржавы, ён павінен быць у аснове ўсяго.

«Гэты падыход мы мэтанакіравана прасоўваем на ўсіх узроўнях, уключаючы АБСЕ, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Знаходзячыся на стыку Еўразійскага і Еўрапейскага саюзаў, Беларусь асабліва зацікаўлена ў іх узаемным збліжэнні. Трэба пераходзіць ад абстрактных гутарак да пэўнага ўзаемадзеяння».

Гэтага, паводле меркавання беларускага лідара, можна дасягнуць у эканоміцы, энергетыцы, экалогіі, гуманітарным супрацоўніцтве, транспарце, лагістыцы, у барацьбе з нелегальнай міграцыяй, трансгранічнай злачыннасцю.

Прэзідэнт дадаў, што гэта нясе велізарныя выгады для ўсяго кантынента — ад Атлантыкі да Ціхага акіяна, і новыя раздзяляльныя лініі з'яўляцца не павінны.

«Трэба зноў навучыцца слухаць і чуць аргументы адзін аднаго, быць гатовымі да разумных кампрамісаў. Гавару і пра расійскіх, і пра еўрапейскіх, і пра амерыканскіх, і пра кітайскіх партнёраў. Аб вялікіх і малых краінах, блізкіх і далёкіх суседзях», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Адной з дзейсных пляцовак для дыялогу і з'яўляецца АБСЕ, Беларусь гатовая да актыўнага ўзаемадзеяння з кіраўніцтвам, выканаўчымі структурамі і інстытутамі гэтай арганізацыі, італьянскім старшынствам, з усімі ўдзельнікамі, якія падзяляюць гэтыя падыходы, дадаў кіраўнік дзяржавы.

## А ШТО РАБІЦЬ ДАЛЕЙ?

«Ужо сёння бачна, што гэтая праца будзе цяжкай, доўгай і запатрабуе кансалідацыі нашых намаганняў. Але мы можам і павінны абапірацца на гэтым шляху на пазітыўны вопыт Хельсінкскага працэсу, які сапраўды вырашыў шмат міжнародных пытанняў, — падкрэсліў беларускі лідар. — Сёння рэальнасцю стаў свет шматпалярны. Узрос уплыў іншых, нееўрапейскіх, рэгіёнаў».

На думку Прэзідэнта, неабходна паступова пашыраць фармат дыялогу ў рамках АБСЕ. Прыцягваць да яго такія краіны, як Індыя, Японія і Кітай.

З прычыны непрымірымасці пазіцый ключавых гульцоў менавіта сярэднія і малыя дзяржавы атрымліваюць унікальную магчымасць ініцыяваць прапановы па дыялогу і мерах даверу.

«Неабходна гэтай магчымасцю скарыстацца, а не выконваць ролю «статыстаў» ці саюзнікаў па ваенна-палітычных блоках, такіх як НАТА або АДКБ. Трэба ў добрым сэнсе парушыць манаполію дыялогу па гэтых пытаннях толькі паміж вялікімі краінамі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён таксама дадаў, што больш адказную пазіцыю варта было б заняць і НАТА, а шматлікія праблемы, з якімі дзяржавы сутыкнуліся сёння, былі выкліканы пашырэннем гэтай структуры на Усход.

Прэзідэнт канстатаваў, што пасля Другой сусветнай вайны, нягледзячы на ўсе рознагалоссі, лідары краін-пераможцаў змаглі дамовіцца, стварыць ААН, якая адыграла і адыгрывае сваю ролю ў гарантаванні бяспекі.

«Больш за 40 гадоў таму ў Хельсінкі нашы папярэднікі выпрацавалі асноўныя прынцыпы мірных узаемадносін і падпісалі Заключны акт, у рамках Хельсінскага працэсу сфарміравалі архітэктуру еўрапейскай бяспекі, — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. — Сёння ўсім дзяржавам — вялікім і малым, усім палітыкам, экспертам трэба задумацца пра тое, што мы пакінем у спадчыну будучым пакаленням, нашым дзецям. Нягледзячы на крызіс даверу паміж некаторымі дзяржавамі, сёння сусветнай супольнасці варта вызначыць канкрэтныя напрамкі супрацоўніцтва, якія адказваюць агульным інтарэсам».

Аляксандр Лукашэнка выказаў надзею, што вынікам канферэнцыі ў Мінску стане выпрацоўка канкрэтных рашэнняў па самых актуальных для чалавецтва пытаннях, такіх як тэрарызм, эканамічная бяспека, экалогія, кіберзлачынствы, міграцыя, урэгуляванне «замарожаных» канфліктаў.

У завяршэнні беларускі лідар заклікаў захоўваць мір і запрасіў у Мінск прадстаўнікоў любых палітычных поглядаў.

## ЯК ДЫЯЛОГ, ТАК І ІМПУЛЬС

Як распавёў генеральны сакратар АБСЕ Томас Грэмінгер, ператварэнне форуму «Мінскі дыялог» у вялікі перамоўны працэс было б выдатным варыянтам. «Мы павінны зноў паказаць сваю прыхільнасць тым абавязацельствам і прынцыпам, якія былі выпрацаваны падчас Хельсінкскага працэсу. Калі гэта будзе той працэс, які дапаможа нам у гэтым, будзе вельмі добра», — сказаў ён.

Томас Грэмінгер таксама назваў крызіс ва Украіне самай вялікай праблемай у рэгіёне і заклікаў надаць палітычны імпульс мінскім пагадненням. На яго думку, арганізацыя з часам зможа прадставіць зручную платформу для дыялогу. У сувязі з гэтым Томас Грэмінгер адзначыў, што АБСЕ трэба падумаць аб «Хельсінкі-2».

Палітык таксама выказаў падзяку Беларусі за сталічную пляцоўку, таму што ёсць сур'ёзная занепакоенасць узаемаадносінамі паміж краінамі ў свеце.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

---

■ Ва ўрадзе

# Лічбавай трансфармацыяй трэба кіраваць

**Ва ўрадзе разгледзелі пытанні дзяржаўнага рэгулявання развіцця лічбавай эканомікі. Падчас пасяджэння Савета па развіцці лічбавай эканомікі прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ адзначыў, што ўкараненне лічбавых тэхналогій ва ўсе сферы вытворчага сектара павінна павысіць эфектыўнасць вытворчасці, забяспечыць канкурэнтаздольнасць прадукцыі. Гэта шмат у чым будзе вызначацца тэмпамі пераходу да новых бізнес-працэсаў.**

«У выніку лічбавай трансфармацыі сістэмы дзяржаўнага кіравання неабходна стварэнне гнуткага і эфектыўнага механізму для рэалізацыі асноўных функцый сучаснай дзяржавы: аховы здароўя, падтрымання міжнароднага ўзроўню сістэмы адукацыі і навукі, бяспекі і юрыдычнай абароны насельніцтва, эфектыўнага кіравання дзяржаўнай уласнасцю і павышэння канкурэнтаздольнасці нацыянальнай эканомікі. Для дасягнення гэтай мэты неабходна мадэрнізаваць тэхналогію прыняцця рашэнняў і метады кіравання», — заявіў Андрэй Кабякоў.

Прэм'ер-міністр звярнуў увагу прысутных, што кіраванне працэсамі лічбавай трансфармацыі — складаная і шматгранная задача. Для яе рэалізацыі патрабуецца адпаведная кіраўнічая структура, якая забяспечыць каардынацыю лічбавай трансфармацыі ўсіх удзельнікаў на міжведамасным узроўні.

Падчас пасяджэння Савета яго ўдзельнікам таксама былі прадэманстраваны падрыхтаваны бізнес-супольнасцю відэаролік пра лічбавую трансфармацыю эканомікі.

**Ільля КРЫЖЭВІЧ.**